Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкавіцкі навучальна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – сярэдняя школа”

# Ганаруся табой мой край
(канспект гутаркі ў 1 рознаўзроставай групе)

Грышчанка Наталія Вікенцьеўна
вышэйшая адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

Мэта: развіццё патрыятычных пачуццяў і любові да сваёй Радзімы.

Праграмныя задачы: фарміраваць паняцце пра малую радзіму; развіваць эмацыянальна - каштоўнасныя адносіны да прыроднага асяроддзя і выдатных мясцінаў роднага краю; выхоўваць любоў да малой радзімы.

Ход гутаркі:

Выхавальнік чытае верш:

Свеціць як сонца,
Ад самай калыскі
Вобраз любімы,
Родны і блізкі.
Маміна імя
Самае лепшае,
Маміна слова
Найдаражэйшае.
Мама! Матуля! -
Чароўнае слова
Песняй ласкавай
Гучыць на ўсіх мовах.

(Мікола Хведаровіч)

Якая матуля? – Родная!

Давайце паўторым пяшчотна і ласкава: - родная матуля.

А як вы разумееце значэнне слова родная?

Родная - значыць, дарагая, блізкая, любімая, мілая.

Пытанне: А каго або што мы яшчэ можам назваць родным?

Адказы дзяцей: тата, брат, сястра, дзядзька, дом, дзіцячы сад, краіна, вёска.

Месца, дзе ўсё роднае і блізкае па-іншаму можна назваць сваёй Радзімай.

Выхавальнік: у кожнага з нас ёсць вялікая Радзіма і малая радзіма. Вялікая Радзіма – гэта наша вялікая краіна. А як яна называецца? (Беларусь)

А ёсць яшчэ малая радзіма – гэта той куток краіны Беларусь, дзе мы нарадзіліся, дзе жывуць нашы бацькі і сябры, дзе знаходзіцца наш родны дом, дзіцячы сад, вёска, аграгарадок. А як наш аграгарадок называецца? (аграгарадок Грыцкевічы)

Вось аграгарадок Грыцкевічы і ёсць наша малая радзіма.

Выхавальнік чытае верш: “Родны край”

О мой любы родны край,
Ты - прыгожы, нібы рай.

І нідзе ў другіх краях
Шчасным быць не змог бы я.

(Ніл Гілевіч)

Фізкультмінутка “Што такое Радзіма”

(Апісанне: дзеці становяцца ў круг, выхавальнік кідае мяч дзецям па парадку і кажа: “Радзіма –гэта...” дзеці ловяць мяч і адказваюць адным словам: лес, поле, рака, дом, вуліца, бацькі, сябры)

Выхавальнік: давйце паглядзім любімыя родныя мясціны нашага аграгарадка (дэманстрацыя фотаздымкаў з выявамі роднага аграгарадка)

Дзеці пазнаюць, называюць родныя мясціны: родны дзіцячы сад, помнік загінуўшым землякам, школа, фізкультурна-аздараўленчы комплекс, лес, малочна-таварная ферма, машынна-трактарны парк, банна-пральны камбінат.

Які наш аграгарадок? ( прыгожы, чысты, утульны).

У нашым аграгарадку жывуць выдатныя людзі, якія клапоцяцца пра родныя вёскі.

Як людзі клапоцяцца пра сваю малую радзіму? (утрымліваюць у чысціні, ўпрыгожваюць газонамі з кветкамі, азеляняюць).

А як вы думаеце, ці можам мы праявіць клопат пра сваю малую радзіму? Як? (утрымаць у чысціні ўчастак, не смяціць, не ламаць галінкі дрэў, не вырываць кветкі, дапамагаць у добраўпарадкаванні)

Калі ўсе мы будзем берагчы і клапаціцца, то наша Радзіма будзе з кожным годам усё больш прыгажай.

Можна скончыць нашу размову мудрымі словамі прыказкі: «Няма зямлі прыгажэй, чым наша Радзіма»

Дзеці паўтараюць прыказку.

Выхавальнік: беражыце і любіце сваю Радзіму: вялікую і малую.